2. *Доти Д.И.* Паблисити и Паблик рилейшнз. – М.: Филинъ, 1996.
3. *Драгичевич-Шешич М.* Культура: Менеджмент. Анимация. Маркетинг. – Новосибирск: ИД Тигра, 2000.
4. *Лебедева Е.А.* Технологии работы учреждений культуры по связям с общественностью // Музей будущего: информационный менеджмент / Сост. А.В. Лебедев. – М.: Прогресс-традиция, 2001.
5. *Тульчинский Г.Л.* Public Relations. Репутация, влияние, связи с прессой и общественностью, спонсорство. – СПб.: СПб. государственная академия культуры; Ин-т культурных программ комитета по культуре Санкт-Петербурга, 1994.
6. *Cutlip S. M., Center A. H., Broom G. M.* Effective Public Relations. – L.: Prentice Hall International, 1994.
7. *Seitel Fraser P.* The Practice of Public Relations. – New Jersey: Prentice Hall, 1998.
8. *The* Practice of Public Relations / Ed. Howard W. – Oxford: Butterworth Heinemann, 1988.

*І.У.Шорац*

## МУЗЕЕФІКАЦЫЯ ПОМНІКАЎ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ПАСТАЎСКАГА ПААЗЕР’Я

Вывучэнне і захаванне помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры як важнейшай часткі нацыянальнай спадчыны заўсёды было адной з важнейшых задач музеефікацыі. Яны з развіццём музейнай справы значна мяняліся. Толькі ў другой палове XX ст. даследчыкі прыйшлі да высновы, што музеефікацыя з’яўляецца адным з важных напрамкаў музейнай дзейнасці і аховы помнікаў. Мэтай музеефікацыі з’яўляецца пераўтварэнне нерухомых помнікаў гісторыі і культуры або прыродных аб’ектаў у аб’екты музейнага паказу дзеля іх захавання, выяўлення гісторыка-культурных, навуковых, эстэтычных каштоўнасцей і актыўнага ўключэння ў сучасную культуру [1, с. 391].

Працэс музеефікацыі помнікаў уключае даследаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помніка, яго кансервацыю і рэстаўрацыю, захаванне і ўзнаўленне мастацка-архітэктурнага або гісторыка-бытавога інтэр'ера, а таксама прыроднага і культурна-гістарычнага асяроддзя. Акрамя гэтага, працэс музеефікацыі ўключае вызначэнне магчымасці інтэрпрэтацыі помнікаў у экспазіцыях музеяў, выстаў, мемарыяльных дамоў, прадугледжвае распрацоўку ўмоў агляду.

Як вядома, аб'ектамі музеефікацыі могуць з'яўляцца: помнікі гісторыі і культуры, помнікі прыроды, памятныя мясціны, культурна-гістарычнае асяроддзе, увогуле ўсё тое, што з'яўляецца матэрыяльнай і духоўнай спадчынай народа.

Аднымі з асноўных этапаў музеефікацыі помнікаў з'яўляюцца працэсы кансервацыі і рэстаўрацыі. Кансервацыя азначае сукупнасць мер, накіраваных на стабілізацыю фізічнага стану помнікаў гісторыі і культуры, на іх доўгачасовую ахову ад уздзеяння тэмпературных змен, разбуральных працэсаў і на забеспячэнне захаванасці помнікаў у канкрэтных умовах бытавання. Даследчыкі вызначылі змест тэрміна "рэстаўрацыя" як комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне пэўнага помніка гісторыі і культуры, твора мастацтва, выяўлення яго мастацкіх якасцей і аднаўленне першапачатковага выгляду. Такім чынам, працэс рэстаўрацыі дазваляе захаваць помнік і яго гістарычны выгляд.

Паміж кансервацыяй і рэстаўрацыяй не заўсёды можна правесці дакладную мяжу, бо гэтыя працэсы адначасова могуць служыць мэтам захавання помніка і мэтам аднаўлення яго першапачатковага выгляду. Метады кансервацыі і рэстаўрацыі адыгрываюць важную ролю ў працэсе музеефікацыі помнікаў.

Кожны гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі мае сваю гісторыю, багатую помнікамі матэрыяльнай і духоўнай культуры або спадчыны [5, с. 69]. Паняцці "матэрыяльная і духоўная культура" і "спадчына" мы ўжываем як сінонімы.

Трэба адзначыць, што пры ўсім багацці і разнастайнасці прац па музеефікацыі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны застаецца малавывучаным або недаследаваным увогуле матэрыял асобных рэгіёнаў Беларусі, у прыватнасці помнікі Паазер'я (Падзвіння), якія з'яўляюцца неад'емнай часткай куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры Беларусі. Асабліва ў гэтым рэгіёне вылучаецца лакальны раён – больш дробная этнаграфічная адзінка – Пастаўскае Паазер’е.

У рэгіёне Паазер’я вялікая колькасць гісторыка-культурных каштоўнасцей знаходзіцца ў малых гарадскіх пасяленнях. Значная іх частка згублена або разбураецца. У гэтай сувязі захаванне, аднаўленне і рацыянальнае выкарыстанне помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры лакальных рэгіёнаў з’яўляецца актуальнай праблемай, якая патрабуе неадкладнага вырашэння.

Вядома, што традыцыйна-бытавая культура Паазер’я ўвогуле вызначаецца сваімі выразнымі прыметамі ў параўнанні з іншымі беларускімі рэгіёнамі. Непаўторны прыродны ландшафт краю, асаблівасці гістарычнага працэсу, сацыяльна-эканамічнага развіцця абумовілі адметныя рысы традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовых жыхароў [4, с. 21].

Да помнікаў матэрыяльнай культуры Пастаўскага Паазер’я можна аднесці архітэктурную спадчыну краю, прадметы паўсядзённага ўжытку, адзення, абутку, якія выраблялі нашы продкі і ўзоры якіх зараз захоўваюцца ў Пастаўскім краязнаўчым музеі і адлюстроўваюць традыцыйную матэрыяльную культуру Паазер’я. Помнікамі матэрыяльнай спадчыны можна лічыць мясцовыя промыслы і рамёствы, што з’яўляюцца не толькі праявай прыстасавання людзей да пэўных геаграфічна-кліматычных умоў, этнаграфічнай гісторыі, але і менталітэту народа, яго светаадчування, эстэтычных прыхільнасцей.

Да помнікаў духоўнай культуры часцей за ўсё адносяць сукупнасць нематэрыяльных помнікаў. Але, як вядома, матэрыяльны помнік у той жа час можа з’яўляцца і духоўным помнікам. Таму тэрмін “духоўны помнік” мае некалькі значэнняў у залежнасці ад таго, у якім кантэксце ён ужываецца.

Помнікамі духоўнай культуры з’яўляюцца маральна-эстэтычныя нормы і правілы, прынятыя ў пэўнай супольнасці, мастацкія каштоўнасці, народная творчасць, народны тэатр і інш. Помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры Пастаўскага Паазер’я можна структурна падзяліць на:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– адрэстаўраваныя і музеефікаваныя;
– помнікі, якія патрабуюць кансервацыі і рэстаўрацыі;
– незахаваныя помнікі.

У Пастаўскім Паазер'і маецца шмат яскравых помнікаў гісторыі архітэктуры, якія адлюстроўваюць працэс развіцця мастацкіх стыляў. Да іх можна аднесці забудову плошчы г.Паставы, архітэктурныя сядзібна-паркавыя ансамблі ў Лынтупах, Варапаеве, Лучаях, Манькавічах і інш.

Ні адзін з еўрапейскіх народаў не страціў столькі помнікаў гістарычнай і культурнай спадчыны, як беларускі народ. Знаходзячыся на памежжы заходне- і ўсходнееўрапейскіх культурных плыняў, розных філасофска-тэалагічных дактрын, паміж моцнымі суседнімі дзяржавамі, ён пастаянна з'яўляўся аб'ектам палітычнай і ідэалагічнай экспансіі, а вельмі часта і ваеннай агрэсіі.

І хаця сёння ўжо няма згаданых знешніх фактараў, помнікі працягваюць знішчацца, таму што існуе шмат іншых прычын. Адна з галоўных – фінансавая, і таму не выдзяляюцца сродкі на музеефікацыю помнікаў, якія могуць увогуле знікнуць. У Пастаўскім Паазер'і такіх помнікаў дастаткова, у асноўным гэта пакінутыя асаднікамі сядзібы, палацава-паркавыя ансамблі буйных уладальнікаў; у закінутым стане знаходзяцца помнікі садова-паркавага мастацтва. Да іх адносяцца Манькавіцкая сядзіба, палацава-паркавы ансамбль у в.Норыца. Увогуле не захаваліся сядзібы былога маёнтка Ясневічы і ў в.Казлоўшчына. На жаль, у закінутым стане знаходзіцца помнік мастацтва – палацава-паркавы ансамбль у Лынтупах [1, с. 329].

Да знішчэння помнікаў прыводзяць такія прычыны, як слабая даследаванасць спадчыны многіх населеных месцаў; недахопы горадабудаўнічых і архітэктурных праектаў; нізкі ўзровень развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы рэстаўрацыі і рэканструкцый забудовы. Як вядома, разам з матэрыяльнай структурай гістарычных аб'ектаў знішчаюцца іх эстэтычныя ўласцівасці, што з'яўляецца нацыянальным багаццем. Праўда, робяцца крокі і па захаванні помнікаў. У Паставах адрэстаўраваны палац графа Антонія Тызенгаўза, прымаюцца меры па добраўпарадкаванні паркавых ансамбляў у г.п. Лынтупы, г.п. Варапаева і пераўтварэнні іх у зоны адпачынку. Гэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

та ў некаторай ступені дазваляе захаваць помнікі садова-паркавага мастацтва. Размяшчэнне ў будынках сядзіб грамадскіх устаноў таксама дазваляе захаваць помнікі для будучага пакалення. Так, напрыклад, у Лынтупах, у былой сядзібе, сёння размяшчаецца сярэдняя школа.

Такім чынам, можна адзначыць, што лёс помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры Пастаўскага Паазер'я самы разнастайны, ён у пэўнай меры адлюстроўвае стан і працэс іх музеефікацыі. Некаторыя помнікі закансерваваны, адрэстаўрыраваны і з'яўляюцца музейнымі аб'ектамі, іншыя па- трабуюць вывучэння для вызначэння іх музейнай каштоўнасці. Пэўная частка помнікаў знаходзіцца ў працэсе кансервацыі і рэстаўрацыі. Завяршэнне гэтай працы дазволіць не толькі ахапіць музеефікацыяй усе значныя помнікі гісторыі і культуры, але і ўзбагаціць нашу духоўную спадчыну.


1. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / Рэдкал.: С.В.Марцэлеў і інш. – Мн.,1985. – 496 с.

2. *Российская* музейная энциклопедия: В 2 т. – М.: Прогресс, 2001. – Т. 1. – С. 390–393.

3. *Памяць*. Гістарычна-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн., 1999. – 822 с.

4. *Скорабагатчанка А.В.* Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я. – Мн., 1997. – 471 с.

5. *Цітоў В.С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь: Краіна і людзі. – Мн., 1996.

6. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.3 / БелЭн; Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мн., 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ